ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (1012) ● ПЯТНІЦА, 28 красавіка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## Са святам!

Першамай. Ён заўсёды прыходзіць з сонцам, з птушыным спевам, са звонкімі вяснянкамі. У ім радасць абуджэння зямлі, радасць нараджэння.

Святам шчасця і маладосці прыходзіць 1 Мая на нашу савецкую зямлю. На вуліцы гарадоў і вёсак краіны выйдуць мільёны працоўных. Яны велічна пранясуць рапарты працоўных дасягненняў, прадэманструюць сваю любоў і адданасць Камуністычнай партыі, роднай дзяржаве, вернасць ідэям Леніна.

У калонах дэманстрантаў разам з будаўнікамі і рабочымі, настаўнікамі і ўрачамі, дзеячамі навукі і культуры пройдзе шматтысячная армія студэнтаў і аспірантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ— буйнейшай навучальнай установы рэспублікі, старэйшай кузні навуковых кадраў. Ім ёсць аб чым рапартаваць: да Першамая яны ідуць з новымі поспехамі ў працы, у вучобе, з новымі навуковымі адкрыццямі.

СА СВЯТАМ ВАС, ДАРАГІЯ СЯБРЫ, З ПЕРШАМАЕМ!

*Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце марксісцка-ленінскім вучэннем, дасягненнямі навукі, тэхнікі і культуры! Будзьце актыўнымі барацьбітамі за ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС!*

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1973 года).*




## З ІМЕМ ЛЕНІНА Ў СЭРЦЫ КОЖНЫМ!

Пад такім дэвізам на філалагічным факультэце адбыўся камсамольскі сход, прысвечаны 103-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі.

Камсамольскія актывісты II курса беларускага аддзялення запрасілі на сход прадстаўнікоў маладзёжных арганізацый з Балгарыі, ГДР, Кубы і В'етнама.

Прэзідэнты зямляцтваў студэнцкай моладзі нашага універсітэта і сакратары маладзёжных арганізацый гэтых краін расказалі прысутным аб гісторыі іх стварэння і ролі перадавых атрадаў юнакоў і дзяўчат у барацьбе за мір, дэмакратыю і сацыялізм. Выступаючыя гаварылі аб вялікім значэнні ленінскага вучэння ў выхаванні моладзі ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Прадстаўнікі Саюза свабоднай нямецкай моладзі паведамілі ўдзельнікам сходу аб падрыхтоўцы да X Сусветнага фестывалю моладзі, які адбудзецца сёлета ў сталіцы ГДР Берліне. Яны прадэманстравалі кінафільмы аб фестывалі нямецкай моладзі.

У заключэнне в'етнамскія сябры паказалі свой кінафільм аб мужнай барацьбе малады патрыётаў у гады суровых выпрабаванняў.

В. КАЛАДЗІНСКІ.

## Госці БДУ

У панядзелак наш універсітэт прымаў дэлегацыю сяброў з ГДР, якія прыбылі ў Беларусь поездам «Дружба». Гасцей вітаў прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце прафесар С. А. Умрэйка. Ён расказаў аб гісторыі універсітэта, пастаноўцы вучэбнай і выхаваўчай работы ў буйнейшай навучальнай установе рэспублікі. Старшыня мясцкома В. Ф. Чыгір адказаў на пытанні, якія датычалі сацыялістычнага спаборніцтва.

Навуковыя работнікі, работнікі вышэйшай і сярэдняй школы ГДР наведалі вылічальны цэнтр, бібліятэку, гістарычны музей, пабывалі на кафедрах і ў лабараторыях хімічнага факультэта і на кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

М. ЛЯПІЛА.

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ

**У ВУЧОНЫМ ЗВАННІ ПРАФЕСАРА:**

ЧЫГІР Васіль Фёдаравіч (кафедра грамадзянскага права і працэсу);

**ДАЦЭНТА:**

ВОЛАХАЎ Георгій Міхайлавіч (кафедра цеплафізікі);

**У ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ КАНДЫДАТА ХІМІЧНЫХ НАВУК:**

НОВІКАЎ Леанід Сямёнавіч;

**КАНДЫДАТА ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫХ НАВУК:**

МАРЫЧАЎ Алег Ігаравіч;

ТАЛОЧКА Марыян Эдуардавіч (кафедра матэматычнага аналізу).

**КАНДЫДАТА ТЭХНІЧНЫХ НАВУК:**

МАЛЕВІЧ Ігар Аляксандравіч (інстытут прыкладных фізічных праблем).

# МОВАЙ КНІГ, ФОТАЗДЫМКАЎ, МАЛЮНКАЎ

Да дня нараджэння У. І. Леніна ў чытальных залах універсітэцкай бібліятэкі наладжаны цікавыя тэматычныя выстаўкі, а ў бібліятэцы на другім паверсе галоўнага корпуса супрацоўнікі кнігасховішча арганізавалі прагляд літаратуры. Увагу шматлікіх наведвальнікаў прыцягнула багацце экспанаваных матэрыялаў. Тут ленінскія працы суседнічаюць з успамінамі аб правадыру яго сяброў і паплечнікаў, багата ілюстраваныя кнігі вядуць у цікавыя падарожжы па ленінскіх мясцінах у нашай краіне і за мяжой.

Арыгінальнае выданне—«Гукавая кніга пра Леніна», у якой сабраны запісы на грамафонных пласцінках прамоў Уладзіміра Ільіча, запісы партыйных і дзяржаўных дзеячоў, рабочых і сялян, вучоных і літаратараў, каму выпала шчасце сустрэцца з Ільічом.

Многія выдавецтвы краіны, рыхтуючыся да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, падарылі чытачам шмат цікавейшых выданняў высокамастацкага паліграфічнага выканання. І ў час прагляду літаратуры іх прыемна было ўзяць у рукі. «Ленін і навука савецкага Кіргізстана», «Ленін і Беларусь», «Ленін і Казахстан», «Ленін і Башкірыя»... «Паклон тайгі»—вершы паэтаў народаў Поўначы, Хабараўскага выдавецтва, кнігі-малюткі і ілюстрацыйныя зборнікі ўнушальных памераў — усё цікава.

Дзякуй гаспадыні прагляду Тані Ліпніцкай і тым, хто дапамог зазірнуць у бібліятэчную скарбонку.

**А. АЛЕНІЧ.**

# ЛЕНІНСКІ ЎРОК

Штогод на падрыхтоўчым факультэце БДУ у гонар дня нараджэння У. І. Леніна праводзіцца Ленінскі ўрок. Сёлета на ім прысутнічалі прадстаўнікі дзевяці краін. Усе яны чулі аб Леніне ў сябе на радзіме, але толькі ў Савецкім Саюзе іх веды аб вялікім правадыру рэвалюцыі і выдатным чалавеку сталі больш глыбокімі і рознабаковымі.

На працягу навучальнага года студэнты-іншаземцы вывучалі біяграфію У. І. Леніна, завучвалі вершы і празаічныя ўрыўкі, прысвечаныя Уладзіміру Ільічу, пісалі конкурсныя сачыненні. А завяршаючым этапам гэтай работы з'явіўся Ленінскі ўрок.

21 красавіка. У актавай зале сабраліся ўсе студэнты і выкладчыкі падрыхтоўчага факультэта. На сцэну выходзіць студэнт з Бангладэш.

— Я русский бы выучил только за то, что им разговаривал Ленин...

Урыўкі з паэмы Маякоўскага «У. І. Ленін» чытаюць студэнты з Конга, В'етнама, Танзаніі. Гучыць музыка, якую любіў Уладзімір Ільіч.

На ўроку студэнты слухалі расказ, насычаны цікавымі фактамі з біяграфіі правадыра, яскравымі прыкладамі, якія сведчаць аб міжнародным значэнні ленінскай тэарэтычнай спадчыны.

У гэтым годзе Ленінскі ўрок супаў з Усесаюзным камуністычным суботнікам. І не дзіўна, што студэнты-іншаземцы працавалі ў гэты дзень дружна, з разуменнем высокага значэння «чырвонай суботы» ў жыцці савецкага народа.

**І. МАЗУРКЕВІЧ,**
**студэнтка.**



*Працоўны семестр-73 прысвячаецца 50-годдзю прысвоення камсамолу імя У. І. Леніна. Заканчваецца фарміраванне атрадаў. А ў начальнікаў штабаў працоўных спраў факультэтаў — новыя клопаты: пачынае сваю работу студэнцкая канферэнцыя па праблемах СБА.*
Фота Д. Чаховіча.

**ПЕРАМОЖЦЫ СПАБОРНІЦТВА**

# ПРАЦА—ІНІЦЫЯТЫВА—ПОСПЕХ

Па выніках спаборніцтва ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР кафедра крыміналістыкі юрыдычнага факультэта заваявала вымпел пераможцы. І, як сцвярджае загадчык кафедры прафесар А. В. Дулаў, не збіраецца яго нікому аддаваць.

Кафедра маладая: ёй толькі-толькі спаўняецца год. Таму, зразумела, ёсць і цяжкасці, і выдаткі росту. Сто сорак гадзін практычных заняткаў, неабходнасць у эксперыменце, доследах, патрабуюць вялікай колькасці абсталявання, прасторных лабараторый. А вось іх якраз і не хапае. Нават памяшканне кафедры нагадвае склад.

Здавалася б, цяжка знайсці нейкае выйсце: на факультэце наогул не хапае пакояў. Але тут дапамагае энтузіязм супрацоўнікаў кафедры І. А. Матусевіч, А. І. Кастрова, Г. Р. Шыханцова і іншых. Сваімі сіламі абсталявалі крыміналістычную лабараторыю. Двухбаковая тэлевізійная сувязь з суседнім кабінетам крыміналістычнай тэхнікі дазваляе вялікай колькасці людзей назіраць за праводзімым эксперыментам. У кабінеце крыміналістычнай тэхнікі абсталяваны магнітафоны клас, а Андрэй Васільевіч ужо марыць аб устаноўцы пульта для выкладчыка.

Па тэмах, не маючых наглядных дапаможнікаў, дэманструюцца дыяфільмы, аўтаматычная кінаўстаноўка дае магчымасць некалькі разоў за час заняткаў прагледзець вучэбныя фільмы па фотасправе і іншыя (дарэчы, іх здымалі зноў жа самі супрацоўнікі кафедры).

Кафедра — ініцыятар выдання першых у Саюзе зборнікаў «Пытанні судовай псіхалогіі». Ужо выйшлі ў свет два выпускі, рыхтуецца трэці. Зборнікі карыстаюцца вялікай папулярнасцю не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Выданню іх садзейнічала абарона дысертацый супрацоўнікамі кафедры: І. А. Матусевіч «Вывучэнне асобы абвінавачваемага на папярэднім следстве», А. І. Кастровым «Праверка паказанняў сведкі на папярэднім следстве», Г. Р. Шыханцовым «Прафесійна-важныя якасці следчага». Закончана дысертацыя Ю. І. Рэўтавым «Апазнанне па голасу», заканчвае доктарскую дысертацыю М. М. Гапановіч. Усе гэтыя работы маюць псіхалагічны ўхіл.

Упершыню ў Саюзе кафедра выдала таксама вялікі вучэбны дапаможнік па судовай псіхалогіі. Ён, а таксама кніга «Судовая фатаграфія» атрымалі Пасведчанне ВДНГ СССР.

Многія супрацоўнікі кафедры ўдзельнічаюць в усесаюзных канферэнцыях па праблемах крыміналістыкі. Адна з такіх канферэнцый хутка адбудзецца ў Мінску.

Кафедра выконвае вялікую грамадскую работу, І. А. Матусевіч, напрыклад, узначальвае навукова-метадычны савет Упраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкома, А. В. Дулаў — член савета пракуратуры рэспублікі, многія выкладчыкі — куратары груп, вядуць навуковыя гурткі. Дарэчы, удзельнікі аднаго з такіх гуртоў дапамагаюць Г. Р. Шыханцову правадзіць цікавую работу па вывучэнню псіхалогіі студэнта. Праўда, сіл малавата, але плён ужо ёсць.

Калі ў А. В. Дулава пытаешся, у чым сакрэт іх поспехаў, ён адказвае: «У людзях, што складаюць наш маленькі калектыў, у жаданні кожнага, не лічачыся з часам, наладзіць вучэбны працэс на высокім узроўні».

**Л. ДРУЗЕВА.**





# НА ЛЕНІНСКІМ СУБОТНІКУ

З вялікім уздымам прайшоў у нашым універсітэце Ленінскі камуністычны суботнік. Усюды ён пакінуў свой адметны след: у скверы і на вуліцах, у вучэбных карпусах і інтэрнатах.



Фота **М. Нечыпарэнкі і Ж. Гулевіч.**

# ДАСЛЕДЧЫКІ СУСТРЭЛІСЯ Ў КІЕВЕ

**Правядзенне штогадовых студэнцкіх навуковых канферэнцый стала ўстойлівай традыцыяй у буйнейшых універсітэтах і інстытутах краіны. Маладыя даследчыкі расказваюць аб выніках сваіх навуковых пошукаў па выбранай спецыяльнасці, знаёмяцца з дасягненнямі равеснікаў з іншых вну.**

У красавіку мне давялося прыняць удзел у XXX студэнцкай навуковай канферэнцыі Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. Гасцямі факультэта кібернетыкі былі прадстаўнікі Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута, Тбіліскага, Варонежскага і Іркуцкага універсітэтаў і шмат іншых вну Савецкага Саюза.

Камітэт камсамола, савет СНТ універсітэта стварылі спецыяльную групу, якая займалася прыёмам гасцей. Нас размясцілі ў інтэрнаце, аформілі пропускі (дарэчы, уваход ва ўсе карпусы універсітэта там строга па пропусках), выдалі праграмы канферэнцыі і нагрудныя знакі ўдзельнікаў.

На наступны дзень адбылося сумеснае пленарнае пасяджэнне факультэта кібернетыкі і механіка-матэматычнага факультэта, якое адкрыў дэкан факультэта кібернетыкі член-карэспандэнт АН УССР І. І. Ляшко. Выступіўшыя затым вучоныя, выкладчыкі і студэнты пажадалі ўдзельнікам паспяховай работы. Асабліва запомнілася жывое, эмацыянальнае выступленне вядомага хірурга-кібернетыка акадэміка М. М. Амосава. Ён расказаў аб рабоце кіруемага ім калектыву па стварэнню эўрыстычных мадэляў. У ходзе выступлення М. М. Амосаў безапеляцыйна заявіў, што класічная матэматыка не мае будучага, а будучае належыць кібернетыцы, чым выклікаў бурную рэакцыю прадстаўнікоў механіка-матэматычнага факультэта.

Затым на працягу трох дзён на факультэце кібернетыкі працавалі шматлікія секцыі і падсекцыі. Было зроблена шмат цікавых дакладаў. На пасяджэннях прысутнічалі вядучыя вучоныя універсітэта. Кожнаму выступленню тут жа давалася падрабязная ацэнка. З навуковым дакладам выступіў на канферэнцыі семнаццацігадовы студэнт пятага курса механіка-матэматычнага факультэта Саша Дворак. Рабілі даклады таксама навучэнцы створанай пры універсітэце фізіка-матэматычнай школы.

У вольны час мы знаёміліся з універсітэтам, са славутасцямі ўкраінскай сталіцы, наведвалі музеі і тэатры. Выкладанне ва універсітэце амаль поўнасцю вядзецца на украінскай мове. Курсы, якія чытаюцца студэнтам факультэта кібернетыкі, у многім адрозніваюцца ад тых, якія чытаюцца ў нас на факультэце прыкладной матэматыкі. Большасць студэнтаў займаецца эканамічнай кібернетыкай. Ім чытаюць лекцыі па эканамічных дысцыплінах. Дарэчы, у студэнтаў-кібернетыкаў не бывае больш трох пар заняткаў у дзень, уключаючы і спецкурсы.

Я лічу, што сувязі паміж ФПМ і факультэтам кібернетыкі Кіеўскага універсітэта, калі яны атрымаюць далейшае развіццё, будуць карыснымі для абодвух факультэтаў.

**А. КРУГЕР,**
**студэнт ФПМ.**

# З УДЗЯЧНАСЦЮ І ЛЮБОЎЮ

Гэты нумар насценнай газеты своеасаблівы: ён прысвечан аднаму чалавеку. І ўсе матэрыялы, усе фотаздымкі — аб ім — старэйшым бібліятэкару, паважанай і любімай шматлікімі студэнцкімі пакаленнямі Анне Аронаўне Эвенчык.

Напярэдадні Першамая Анна Аронаўна пайшла на заслужаны адпачынак, і рэдкалегія газеты «Бібліятэкар» цёпла і сардэчна расказала аб працаўніцы, чые адносіны да справы і да людзей служаць узорным прыкладам.

Ужо толькі дзве лічбы, вынесеныя к загалоўку, — красамоўны каментарый да біяграфіі: агульны працоўны стаж—54 гады, з іх 29—у бібліятэцы БДУ.

А потым успамінаюць сваё студэнцтва і ролю ў ім Анны Аронаўны прафесары і загадчыкі кафедр, кандыдаты навук — людзі, якім дапамагаў падымацца па лесвіцы навукі сціплы працаўнік бібліятэкі.

Прачытаем некалькі радкоў:

«Мы, хто прыйшоў ва універсітэт неўзабаве пасля вайны, ніколі не забудзем, што першыя кніжкі ў бібліятэцы нам выдавала Анна Аронаўна, — мілы, спагадлівы, цудоўнай душы чалавек...» (М. Я. Цікоцкі, доктар філалагічных навук).

«Мяне заўсёды здзіўляла яе вялікая душэўнасць, вялікая добразычлівасць...» (В. В. Свірыдаў, загадчык кафедры неарганічнай хіміі). І далей дацэнты А. Р. Улазава, Г. І. Васільева, кандыдаты навук Л. І. Неакладнава і Л. А. Ільюкевіч успамінаюць, як аднолькава клапатлівымі, уважлівымі былі адносіны А. А. Эвенчык да запатрабаванняў і студэнтаў, і аспірантаў, і выкладчыкаў.

Гэта словы з газеты, а яшчэ больш іх — цёплых, душэўных, якія ішлі ад самага сэрца, — было сказана самой Анне Аронаўне ў час урачыстасцей у 206-й аўдыторыі галоўнага корпуса. Маса кветак, падарункі, сардэчныя віншаванні яскрава пасведчылі, якая гэта вялікая каштоўнасць — працавітасць і душэўная абаяльнасць.

**А. АРЛОВА.**

# СЯМЕЙНАЕ ПРЫЗВАННЕ





На біяфак мы прыйшлі ў 1968 годзе. Цяпер займаемся на V курсе. У гэтым годзе студэнткай біяфака стала і наша сястра Святлана. Што прывяло нас на біяфак? Напэўна, пастаянны кантакт з прыродай. З дзяцінства мы любілі падарожнічаць. Вясной, у перыяд разліву, ішлі ўніз па цячэнню ракі, на крутых берагах якой праз снег прабіваліся першыя кветкі. Знайсці далікатную кволую кветачку было для нас вялікай радасцю. Пазней, калі ўсюды зацвіталі печаночніцы, ветраніцы, хахлаткі і медуніцы, мы засушвалі паміж лісткамі паперы кветачкі і лісце рознай афарбоўкі, мудрагелістай формы, збіралі экзатычныя «ведзьміны мётлы», амелу, цікавыя формы галінак, якія напамінаюць розных жывёл, кавалачкі моранага дуба. Летам, калі лугі запальваліся агнямі рознакаляровых кветак, назіралі за ажыўленай працай насякомых. Усё гэта было вельмі захапляюча.

З 1965 года, калі наш старэйшы брат Міхаіл стаў студэнтам біялагічнага факультэта Даўгаўпілскага педінстытута, мы пачалі ствараць гербарый вышэйшых раслін. Першай была гарачаўка лёгачная. Цяпер наш гербарый прадстаўлен больш чым 2000 відамі, з іх 900 сабраны ў Беларусі, 1100—у іншых кутках нашай краіны. Паралельна мы збіралі калекцыі насякомых. Так мы пачыналі.

Паступіўшы ва універсітэт, мы яшчэ першакурснікамі выбралі кафедру сістэматыкі раслін. Тут мы знайшлі тое, што нас больш за ўсё прыцягвала, і змаглі па-сапраўднаму заняцца вывучэннем флоры нашай рэспублікі. На другім курсе па заданню кафедры мы разам з Генадзем Вынаевым і Віталем Маўрышчавым выконвалі работу па вывучэнню флоры Налібоцкай пушчы. На рэспубліканскім конкурсе навуковых студэнцкіх работ яна была аднесена да II катэгорыі.

На трэцім і чацвёртым курсах летам удзельнічалі ў навуковых экспедыцыях, арганізаваных Інстытутам эксперыментальнай батанікі АН БССР. Тут мы вывучалі дынаміку балотнай і лясной расліннасці у сувязі з гаспадарчай дзейнасцю чалавека, а таксама запасы лекавых раслін на Палессі.

Вялікі ўплыў на фарміраванне нашых навуковых поглядаў аказалі загадчык лабараторыі флоры і гербарыя АН БССР Віктар Іванавіч Парфенаў і старшы навуковы супрацоўнік Наталля Вітальеўна Казлоўская. Дзякуючы ім мы падышлі да праблемнага вывучэння флоры.

Сястра больш цікавілася жывёльным светам. Спачатку калекцыяніравала разам з намі насякомых, разводзіла рыбак у акварыуме, пазней захаплялася крολікамі і іншымі жывёламі. Любіла назіраць за птушанятками драздоў, ластавак, чыбісаў.

Святлана толькі пачынае свой шлях біёлага, а мы ўжо хутка развітаемся з універсітэтам, са сваёй кафедрай. Але куды б ні закінуў нас лёс, мы заўсёды і ўсюды будзем вернымі свайму прызванню.

**Васіль і Аляксандр ГРАЧУХІ,**
**студэнты V курса біяфака.**

**Загадчык кафедры рускай класічнай літаратуры, пісьменнік Павел ТКАЧОЎ, аўтар кніжак пра Леніна «Вішнёвая квецень», «Сэрца камунара», «Пілілка з Галубінай Слабодкі», «Імя Леніна ў сэрцы нашым», працуе над новымі творамі пад агульнай назвай «Самае галоўнае. Штрыхі да партрэта Ільіча».**

**Прапануем нашым чытачам два апавяданні з гэтай кніжкі.**

# «ДРОБЯЗЬ»

Усім вядома, як уважліва Уладзімір Ільіч ставіўся да людзей. Заўсёды імкнуўся ён прымаць наведвальнікаў у дамоўлены час. Калі ж здаралася, што тэрміновыя справы затрымлівалі, ён абавязкова прасіў прабачэння сам або праз свайго сакратара.

Неяк адразу пасля пераезду Савецкага ўрада ў Маскву Ільічу паведамілі, што яго хоча бачыць група сялян.

— Добра, — згадзіўся Ленін, — заўтра ў 11 гадзін.

На наступны дзень сяляне загадзя сабраліся ў прыёмным пакоі Уладзіміра Ільіча. Селі ў крэслы і паціху павялі сваю сялянскую размову. Тут жа быў новы сакратар Леніна, малады, даволі прыгожы чалавек. Ён толькі першы раз выконваў свае сакратарскія абавязкі.

Хутка 11 гадзін. У гэты час Уладзімір Ільіч у так званым камутатарскім пакоі, што размяшчаўся побач з яго кабінетам, вёў па тэлефону размову з Петраградам. Тэлефонная сувязь тады была вельмі дрэнная, і размова з... нулася. Уладзімір Ільіч папрасіў свабодную ад работы тэлефаністку паклікаць сакратара. Калі той увайшоў, сказаў яму:

— Калі ласка, папрасіце ад майго імя прабачэння ў сялян. Няхай пачакаюць дзесяць хвілін.

Сакратар здзівіўся:

— Уладзімір Ільіч, гэта ж дробязь — дзесяць хвілін... — дагаварыць ён не паспеў, Ленін адвярнуўся і папрасіў у трубку:

— Адну хвілінку! — Потым, паклаўшы трубку на стол, выйшаў.

Калі сакратар вярнуўся ў прыёмны пакой, ён пачуў ажыўленую гаворку сялян.

— Сказаць каму — не паверыць, што Ленін прасіў прабачэння. А яно як... — гаварыў стары барадаты селянін. — Нашага старасту, Міхала Еўдакімавіча, чакаеш-чакаеш, прыйдзе — і хоць бы што. Яшчэ і накрычыць. А тут, бач ты, чалавек усёй Расіяй кіруе, а зайшоў: «Даруйце мне, крыху затрымаюся...»

Сакратар прыслухоўваўся да размовы, і яму рабілася не па сабе.

Потым, калі сяляне, вельмі задаволеныя размоваю з Леніным, пайшлі, Ільіч зайшоў у прыёмную.

— Запомніце, таварыш, — звярнуўся ён да сакратара, — у любой працы дробязей няма. Асабліва калі справа датычыцца людзей...

# «СПАЧАТКУ «СПРАВЫ...»

Сяргей Багоцкі спачатку нават не паверыў: Ленін прыязджае ў Кракаў!? Зноў перачытаў пісьмо — там ясна напісана: заўтра Ульянавы будуць у Кракаве. «Сустрэнецеся насупраць Ягелонскага універсітэта», — гэтую фразу таварышы з Парыжскага камітэта палітзняволеных падкрэслілі двойчы.

«Добра, вельмі добра!»— Ад хвалявання Сяргей не мог уседзець на месцы. Ён падняўся і пачаў хадзіць па пакоі з кутка ў куток — прывычна! Не адну вярсту адмераў ён у турэмных камерах царскай Расіі. Яму ўспомніўся Кіеў, дзе ён навучаўся і дзе ўступіў у рады партыі. Потым, гэта было ў памятным 1904 годзе, Кіеўскі камітэт РСДРП накіраваў яго ў Варшаву для работы сярод салдат гарнізона. Там ён пасябраваў з Феліксам Дзяржынскім. Затым арышт і чатыры гады катаргі. Пасля катаргі — пасяленне ў Сібіры, уцёкі за мяжу. І вось Сяргей Багоцкі ў Кракаве. Рэгулярна наведвае універсітэт, слухае лекцыі па медыцыне. Для ўсіх ён, Сяргей Багоцкі, студэнт («Праўда, ужо пераваліла за 33, студэнт даволі стараваты», — ён усміхаецца), будучы ўрач, выдавец часопіса, для нямногіх — рэвалюцыянер, член сацыял-дэмакратычнай партыі Польшчы і Літвы.

Багоцкі спыняецца ля акна, думае: як ён пазнае Леніна?! Сустракацца з ім не даводзілася. Але Багоцкі шмат чуў пра яго ад знаёмых па партыі, чытаў яго творы...

«Ленін, відаць, высокі, шыракаплечы. І барада... Напэўна, чорная». «Высокі, шыракаплечы» — цяжка было ўявіць інакшым Леніна, хто яго не бачыў. А вось чаму ў яго павінна быць чорная барада—невядома...

На другі дзень Сяргей Багоцкі ва ўмоўлены час сядзеў на лаўцы насупраць будынка універсітэта. Ён пільна ўглядаўся ў прахожых, але ніхто з іх не быў, на яго думку, падобны на Леніна.

Багоцкі паглядзеў навокал: з правага боку сядзела маладая пара, з левага, зусім непадалёку ад яго, — жанчына і мужчына. Яны аб нечым ціхенька размаўлялі і час ад часу паглядалі навокал. Відаць, таксама некага чакалі.

«Дзе ж Ленін? Чаму яго няма? — хваляваўся Багоцкі. — Што магло здарыцца?»

А Уладзімір Ільіч і Надзежда Канстанцінаўна сядзелі зусім побач і чакалі яго — Сяргея Багоцкага.

— Здаецца, Надзюша, гэта і ёсць таварыш Багоцкі, — кіўком галавы Ленін паказаў на свайго суседа.

Надзежда Канстанцінаўна ўстала і звярнулася:

— Даруйце, калі ласка, ці не вы гэта Багоцкі?

Сяргей утаропляна глядзіць на жанчыну і потым нерашуча кажа:

— Та-ак! А вы, відаць, пані Ульянава?!

Яны знаёмяцца. Сяргей адчувае моцны поціск рукі Леніна, і яго прыгожы, крыху прадаўгаваты твар кранае ўсмешка.

— Чаму гэта вы, бацечка, усміхаецеся? — Уладзімір Ільіч уважліва глядзіць на Багоцкага, і той расказвае, якім ён уяўляў яго, Леніна.

— З чорнай барадой?!— перапытвае Уладзімір Ільіч і весела смяецца. — Ну і фантазёр жа вы...

Па дарозе ў гасцініцу Уладзімір Ільіч распытваў пра ўмовы жыцця, пра сувязі з Расіяй, пра рабочы рух. Багоцкі, не спяшаючыся, расказваў. Потым, перад развітаннем, Ленін папрасіў:

— Галоўнае, дапамажыце наладзіць рэгулярную сувязь з Піцерам. Вельмі неабходна.

— Думаю, што гэта можна зрабіць, — адказаў Багоцкі. — І даволі хутка.

— Хутка? А як? — Уладзімір Ільіч спыніўся, і ў яго стомленых, крыху прыжмураных вачах Багоцкі заўважыў нецярпенне. — Ну, ну... Выкладайце ваш план.

— Аб справах заўтра, Уладзімір Ільіч. З дарогі... стаміліся... Трэба адпачыць, — Багоцкі гаварыў няўпэўнена і сам адчуваў, што Леніна пераканаць цяжка, немагчыма.

— Адпачыць? Спачатку, даражэнькі, справы. Адпачываць будзем тады... пасля рэвалюцыі, а зараз пагамонім пра ваш план.

Багоцкаму нічога не заставалася, як расказаць усё тое, што датычала сувязей з Расіяй.

— План просты, Уладзімір Ільіч. Вельмі просты.— Багоцкі дастаў папяросы, але закурваць не стаў. — З Аўстра-Венгрыяй у Расіі дагавор. Мясцовае насельніцтва прыгранічнай паласы мае дазвол пераходзіць граніцу па спецыяльных пасведчаннях. Гэта звычайная паперка, дзе напісана прозвішча, месца жыхарства—і ўсё. Разумеецца, такімі пасведчаннямі карыстаюцца нават для таго, каб прыехаць з Расіі ў Кракаў на базар. Пры дапамозе сялян, рабочых можна перапраўляць у Расію нелегальную літаратуру, пошту.

— Гэта цікава, — задуменна сказаў Ленін, а потым весела дадаў: — Надта цікава. Заўтра ўдакладнім сёе-тое і пачнем працаваць.

Па таму, як сказаў Ленін, Надзежда Канстанцінаўна зразумела: план Багоцкага Уладзіміру Ільічу спадабаўся, спадабаўся і сам Багоцкі.

* * *

Потым яны — Ленін і Багоцкі — часта будуць сустракацца ў Кракаве, будуць разам працаваць.

Сустрэнуцца і пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Успомняць сумесную працу, пасмяюцца над «чорнай барадой»... Багоцкі напомніць Уладзіміру Ільічу пра першую размову, яго абяцанне адпачыць пасля рэвалюцыі.

— Зараз толькі і пачынаюцца сапраўдныя справы. Тады мы толькі рыхтаваліся да іх. Вось так, даражэнькі. — І на стомленым твары Леніна з'явіцца ўсмешка.

## СЯБРАМ НА ПАМЯЦЬ

Напярэдадні 1 Мая ва універсітэт прыйшло пісьмо ад малдаўскіх студэнтаў з чароўным падарункам — Марцішорам. Вось якая яго гісторыя.

З даўніх часоў людзі сустракаюць вясну вясёлымі ўпрыгожаннямі. У нас, у Малдавіі, гэта Марцішор — кветка беленькая, якая сімвалізуе чысціню сэрца, дружбу, і чырвоненькая, якая сімвалізуе сілу, здароўе, румянец дзявочых шчок.

Гэта было даўно... Была цяжкая зіма, снег сыпаў няспынна. Навокал было холадна, і толькі маленькі падснежнік, які выглядваў з-пад снегу, прадвяшчаў вясну. Але вось і яго снег засыпаў. Аб гэтым даведалася прынцэса Беласнежка і прыйшла на дапамогу. Яна пачала адграбаць снег, і хутка паказалася беленькая галоўка падснежніка. Але, дапамагаючы яму вызваліцца са снежнага палону, Беласнежка накалола пальчык. Закапала кроў на снежны дыван, і некалькі капель афарбавалі пару пялёсткаў у чырвоны колер. Каб не аддаць кветачку Лютаму Марозу, Беласнежка сарвала першынец Вясны і прыкалола на грудзях, удыхаючы цяпло ранняй Вясны.

З той пары людзі дораць адзін аднаму Марцішоры, якія прыносяць шчасце.

# ПАЧАТАК

**У школе, у геалагічнай экспедыцыі, на метэастанцыі — дзе толькі не сустрэнеш выпускнікоў геаграфічнага факультэта...**

**У гэтым кабінеце пачынаючыя географы ўпершыню знаёмяцца з такімі цікавейшымі навукамі, як метэаралогія і кліматалогія. Тут пазнаюць азы адной з самых рамантычных прафесій — метэаролага. І, напэўна тут канчаткова вызначыўся не адзін жыццёвы шлях.**

**Сёння лабараторныя заняткі ў трэцяй групы I курса. Ці то ад узросту студэнтаў, ці то ад непрывычнай непасрэднай атмасферы заняткі гэтыя крыху падобны на школьны ўрок. Параўнанне з ім выклікаюць нават пытанні студэнтаў — адразу ж па ходу, з месца — і ўзнятыя над сталамі рукі: «Дазвольце адказаць!». І сама выкладчыца — Аляксандра Міхайлаўна Багуслова — нечым нагадвае добрую настаўніцу. Толькі тэрміны, якімі тут аперыруюць, далёка не школьныя.**

**— У мінулы раз мы знаёміліся... — коратка расказваецца аб прыборах для вымярэння тэмпературы паветра і глебы, іх відах, практычным прымяненні.**

**— Сёння пазнаёмімся... — на стале паяўляецца тэрмограф. Аляксандра Міхайлаўна коратка характарызуе яго. Групе прапаноўваецца замаляваць прыбор у сшытках. А потым пачынаецца апрацоўка стужкі тэрмографа. Не адразу і не ўсё атрымліваецца, але Аляксандра Міхайлаўна паспявае некалькі разоў падысці да кожнага стала. Нанесены ўсе папраўкі на стужку тэрмографа. Матэрыял замацоўваецца.**

**Лабараторныя закончыліся. Звычайныя, радавыя лабараторныя...**

**— Мне, напрыклад, вельмі падабаюцца заняткі. Заўсёды цікава...**

**— Мы на вуліцы займаліся, вызначалі інтэнсіўнасць сонечнай радыяцыі, — з захапленнем расказваюць на перапынку першакурснікі.**

**Ужо не гучаць незнаёма для іх «барограф», «геліограф», «піранометр Янішэўскага»... За гэты год навучыліся многаму. Напрыклад, весці адлік часу: дэкрэтнага, паяснога, сонечнага, вымяраць атмасферны ціск, праводзіць бараметрычнае нівеліраванне, будаваць графікі ходу элементаў радыяцыйнага балансу. Заўсёды была задаволена выкладчыца работай Л. Зялёнай, В. Дашчынскай.**

**Хутка залік. А другі курс пазнаёміць сённяшніх першакурснікаў з кліматалогіяй. Ці стануць гэтыя навукі для каго-небудзь вядучымі — цяжка сказаць.**

**— Спецыялізацыі такой у нас няма. Але нашы выпускнікі працуюць на гідраметэастанцыях, у абсерваторыі... — гаворыць А. М. Багуслова.**

**Можа на такіх вось лабараторных хтосьці з гэтых студэнтаў вырашыць звязаць сваю будучыню з метэаралогіяй. Можа якраз яны — першы крок у выбраным кірунку.**

**Т. КОСЦІНА.**



*СТУДЭНЦКАЯ ПРЭМ'ЕРА.*

# КАБ БЫЛО ЗАЎТРА

**АДГРЫМЕЛІ апладысменты ў перапоўненай актавай зале. Закончылася прэм'ера спектакля «Каханыя» па п'есе Т. Ян, падрыхтаваная студэнцкім тэатрам БДУ. Здавалася б, зусім не новая тэма: ён, яна, каханне і вайна. Дык чаму глядач пакінуў залу такі ўсхваляваны? Ці толькі таму, што на сцэне былі аднакурснікі і сябры па факультэту?**

Спектакль, як кажуць, «крануў сэрца», прымусіў гледача нейкі час быць удзельнікам падзей, думаць, разважаць з героямі. Сюжэт просты: партызанская сувязная Каця Берастава трапіла ў рукі фашыстаў. На адзін з допытаў яе вядзе афіцэр, у якім Каця пазнае свайго школьнага сябра і дарагога ёй чалавека — Паўла Мароза. Павел аказваецца савецкім разведчыкам. Ён хоча выратаваць Кацю, але зрабіць гэта не ўдаецца...

Творча асэнсаваная рэжысёрам тэатра, заслужаным артыстам Латвійскай ССР А. М. Озеравым, і прапушчаная праз сэрцы самадзейных артыстаў, п'еса атрымала філасофскае гучанне.

Знамянальна ў гэтым сэнсе фігура Лялечніка. Ён паяўляецца ў адной толькі, першай сцэне, і расказвае нешта накшталт прытчы пра страшыдла, якое харчуецца сваім жа страхам, расце, а потым лопаецца.

Глыбокі філасофскі сэнс, закладзены ў гэтай прытчы, раскрывае асноўную ідэю трагедыі: з усіх выпрабаванняў выйдзе пераможцам той, хто пераможа ў сабе страх.

Кожная сцэна спектакля напоўнена гэтай галоўнай ідэяй, але асабліва ярка выражана яна ў дыялогу дзвюх сябровак — Каці і Марыны, якая на допыце прызналася фашыстам у прыналежнасці да партызан. Марына гаворыць аб тым, што трэба неяк вытрымаць у гэтай страшнай завірусе, якая завецца вайной, што пераможа той, хто выжыве. А паняцці доўг, Радзіма страцілі свой ранейшы сэнс. Каця пярэчыць:

— Пераможа той, хто зможа выбраць.

Словы Каці адрасаваны не толькі Марыне. Яны гучаць у залу, пачынаючы цікавы дыялог акцёра і гледача аб сэнсе жыцця, шчасці і чалавечай годнасці.

Дыялог працягваецца і ў размовах Каці і Паўла, якім бязлітасны лёс адвёў толькі сем гадзін для шчасця, для таго, каб вырашыць, у чым жа галоўнае прызначэнне чалавека на Зямлі, сказаць «так» альбо «не», жыццё альбо смерць? Гераіня выбірае апошняе. Яе ўпартасць здзіўляе нават нямецкага афіцэра, які зусім шчыра пытаецца:

— Дзяўчынка, ты што, хочаш выйграць усю вайну адна?

Так, яны перамаглі, рабяты з Гогалеўскага бульвара Масквы. Сваё лагічнае завяршэнне ідэя спектакля атрымлівае ў сцэне са званочкам. Каця застанецца жыць, калі зможа вывернуцца з-пад куль нямецкага салдата Франца, што з завязанымі вачыма страляе толькі на гук званочка на дзявочай шыі. Але Каця Берастава хоча да канца застацца чалавекам. Яна зрывае званочак...

Спектакль «Каханыя» своеасаблівы па форме. Промні пражэктара выхопліваюць з цемры тую ці іншую сцэну і тым самым не толькі сканцэнтроўваюць увагу на пэўных героях, а прымушаюць рабіць абагульненне, успрымаць не толькі канкрэтныя сітуацыі, а суадносіць іх з падзеямі часу, мераць меркай сённяшняга дня.

Спектакль выгадна адрозніваецца ад іншых тым, што ён больш акцёрскі. Пазбаўленая класічнасці прафесійных тэатраў, п'еса толькі выйграе ад гэтага.

Зусім непасрэднай, шчырай, праўдзівай паяўляецца перад намі Каця Берастава ў выкананні Л. Дубікавай. А як паступова і па-майстэрску раскрывае характар свайго героя А. Касцецкі (Павел Мароз). Нельга ўявіць іншай Нонку (Н. Пекарская), дзяўчыну, якая канчаткова заблыталася ў жыцці, трапіла, як яна сама гаворыць, у «мышалоўку». Праўдзівыя Курт (В. Калашнікаў), Франц (К. Кукса). Не зусім цэльным атрымаўся вобраз фрау Берты (В. Кір'янава). І ўжо зусім не ўспрымаецца нямецкі маёр у выкананні А. Зартайскага. Ён прагучаў у трагедыі нечакана і недарэчы сатырычна.

Удалай рэжысёрскай знаходкай можна лічыць музычнае афармленне спектакля. Добра ўплятаюцца ў сцэны, робячы больш моцным эмацыянальнае ўспрыняцце п'есы, усім даўно вядомыя і раптам загучаўшыя зусім па-іншаму мелодыі «На безымяннай вышыні», «Журавы» на словы Р. Гамзатава, «Свяшчэнная вайна», «З чаго пачынаецца Радзіма».

Героі спектакля мараць аб тым, каб прыйшло заўтра, і нашчадкі паверылі, што ўсё было іменна так. І вось сустрэліся ўжо не проста трое: ён, яна і вайна, сустрэліся два пакаленні, і самадзейныя акцёры тэатра дапамаглі ім зразумець адно аднаго.

Л. ПЕРАСЫПКІНА.

# НАЗАЎСЁДЫ ПАМЯТНАЯ

Кожная мясціна мае сваю непаўторную рысу ў які-небудзь адзін сезон, яна нават у памяці людзей асацыіруецца ці то з прыгажосцю зімовага дывана, ці з суквеццем стракатых кветак, ці з золатам асенняй лістоты. Калі нам гавораць аб пушкінскім Болдзіне, мы ўяўляем цудоўны асенні пейзаж, чысціню блакітнага неба, а Бежын луг Тургенева — гэта бестурботныя, напоўненыя цікавымі падзеямі лясной хронікі летнія дні.

Калі я ўспамінаю Хатынь, вёску, па-варварску знішчаную катамі, перада мной паўстаюць беластволыя бярозкі, якія вось-вось распусцяцца. Гэта яны нібыта расступіліся перад шырокай плошчай, якую там-сям усцілае шэра-зялёны абрус травы. Растуць тут старыя высокія бярозы з прабітымі ствапамі, побач цягнуцца ўверх маладзенькія іх сястрычкі. Тыя, што ўзвышаюцца над гэтай маладой парасллю, помняць, як у такі веснавы дзень 1943 года палаў крывавым полымем хлеў, як цішыню наваколля абдаваў бездапаможны крык дзяцей, жанчын, а потым ён сціх, змяніўся аўтаматным стрэлам.

У мінулую нядзелю, калі мы, жыхары інтэрната № 4 БДУ, крочылі па свяшчэннай зямлі вёсачкі, у кожнага міжволі моцна сціскалася сэрца.

Помнік Іосіфу Камінскаму з загінуўшым сынам на руках, хлеў, дзе нямецкія вар'яты спалілі іх, ні ў чым не павінных жыхароў Хатыні, сімвалічныя вянкі хат з комінамі-званамі і іх звон...

Жаўрук узвіўся ў чыстае неба, адкуль пяе гімн новаму дню, але Хатынь назаўсёды застанецца ў памяці не спевам гэтай птушкі ў мірны дзень. У памяці засталася тая Хатынь, аб якой расказала экскурсавод.

Хочацца падзякаваць студсавету і каменданту інтэрната № 4 за гэтую хвалюючую паездку.

У. СУБАТ,
член карпункта прафкома універсітэта.

СПОРТ

## На фехтавальных дарожках

Кіламетры—не перашкода дружбе студэнтаў БДУ і ЛДУ. Некалькі разоў у год абменьваюцца універсітэты дэлегацыямі: навуковымі, спартыўнымі...

Нядаўна ў Ленінградзе гасціла каманда фехтавальшчыкаў БДУ. Адбылася сустрэча беларускіх і ленінградскіх спартсменаў на фехтавальных дарожках. Перамогу атрымалі гаспадары. Наша каманда выступала нядрэнна, але з прычыны таго, што мацнейшыя яе прадстаўнікі не змаглі выехаць на сустрэчу, яна не дабілася жаданых вынікаў. Але гэтыя спаборніцтвы з'явіліся выдатнай трэніроўкай і праверкай сіл маладых членаў каманды.

Наш кар.

# ПРЫНЦЫПЫ СПАРТЫЎНАЙ ТРЭНІРОЎКІ

Пачынаючы размову аб фізкультуры і спорце*, мы прыйшлі да вываду аб неабходнасці для людзей разумовай працы сістэматычных заняткаў. Студэнт, выкладчык, супрацоўнік, на наш погляд, павінен, калі ён хоча быць здаровым, займацца фізічнымі практыкаваннямі, плануючы для гэтай мэты штодзённа частку свайго свабоднага часу.

Лепш за ўсё, калі студэнт выбірае для заняткаў адзін з 24—25 відаў спорту, якія прыжыліся ў нашым універсітэце. Заняткі ў секцыі пад кіраўніцтвам трэнера прынясуць найбольшае задавальненне, дазволяць падняцца да пэўных вышынь спартыўнага майстэрства, умацуюць фізічна і будуць садзейнічаць удасканаленню маральна-валявых якасцей, вельмі патрэбных у далейшай дзейнасці маладога спецыяліста.

Калі ж па якой-небудзь прычыне вы не можаце займацца ў спартыўнай секцыі, то трэба практыкавацца самастойна. Гэта могуць быць кросы, заняткі агульнаразвіваючымі практыкаваннямі, заняткі гантэлямі (для асоб без адхіленняў з боку сардэчна-сасудзістай сістэмы), абавязковыя заняткі ранішняй гімнастыкай і фізкультпаузы ў перыяд напружанай разумовай працы.

Перш чым перайсці да апісання кожнага віду заняткаў, хацелася б зрабіць маленькі ўступ.

Кожны чалавек, які вырашыў займацца фізічнай культурай самастойна, павінен выканаць тры ўмовы: па-першае, прайсці **медагляд** у нашай паліклініцы, даведацца аб стане свайго здароўя, пагутарыць з урачом аб нагрузках.

Па-другое, ведаць асноўныя прынцыпы спартыўнай трэніроўкі. Якія ж яны? Гэта **рэгулярнасць і паступовасць.** Толькі рэгулярныя заняткі даюць станоўчыя зрухі ва ўмацаванні здароўя.

Прынцып паступовасці прадугледжвае пачатак заняткаў з маленькай нагрузкі, а пасля паступова, з дня ў дзень, з месяца ў месяц павелічэнне яе за кошт колькасці выконваемых практыкаванняў, хуткасці іх выканання, ускладнення іх, павелічэння часу на самастойную трэніроўку.

Па-трэцяе, пры выкананні фізічных практыкаванняў трэба ўмець пра**вільна дыхаць.** Пры глыбокім дыханні кроў дастаткова насычаецца кіслародам, што садзейнічае нармальнаму працяканню акісляльна-аднаўленчых працэсаў у арганізме. Удых і выдых як у спакоі, так і пры фізічных практыкаваннях трэба рабіць праз нос.

Пры нахілах уперад, прысяданнях, паваротах тулава рэкамендуецца рабіць выдых. Пры выпрамленні тулава — удых. Выкананне гэтых правіл зробіць заняткі найбольш эфектыўнымі.

У наступны раз мы спынімся на кросавым бегу.

**У. РЭЙЗІН,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

* Працяг. Пачатак гл. у № 11 за 5 красавіка 1973 г.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
АТ 05198
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Заказ 500.